Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________ Н.У.Карчэўская
20.03. 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6/26-31/ эвуч.

# ГІСТОРЫЯ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма ўстановы адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 №274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*А.А.Трусаў,* дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю.В.Кавалёва,* вучоны сакратар дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска», кандыдат культуралогіі;

*Н.Я.Петушко*, загадчык кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №6 ад 30.01.2026);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 18.02.2026)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль «Матэрыяльная культура Беларусі» складаецца з вучэбных дысцыплін «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» і «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей». Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі».

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» спрыяе падрыхтоўцы студэнтаў да практычнай дзейнасці, да больш паглыбленага аналізу і апісання розных відаў гістарычных крыніц. Авалоданне тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова развітога спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» вызначаецца яе роляй у працэсе падрыхтоўкі навуковых супрацоўнікаў музейных і турыстычных устаноў.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» – фарміраванне сацыяльнай і адукацыйнай кампетэнцыі студэнтаў, а таксама агульных уяўленняў аб шматгранным працэсе развіцця матэрыяльнай культуры ў розныя эпохі гісторыі грамадства.

Важнейшымі *задачамі* вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» з'яўляюцца:

– раскрыццё сутнасці і паслядоўнасці гістарычнага развіцця матэрыяльнай культуры чалавецтва ад яе вытокаў да сучаснасці;

– асэнсаванне ролі археалагічных, этнаграфічных і пісьмовых крыніц для вывучэння гістарычнага мінулага насельніцтва Беларусі;

– вывучэнне матэрыяльных аспектаў грамадскага і штодзённага побыту і культуры паўсядзённасці;

– вызначэнне залежнасці развіцця беларускага этнасу ад культурных, палітычных, эканамічных і іншых прычын.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» накіравана на фарміраванне ў студэнтаў наступных кампетэнцый:

аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістарычныя падзеі і працэсы, дасягненні сусветнай і айчыннай культуры, агульныя заканамернасці фарміравання культурнай спадчыны;

характарызаваць асноўныя тэндэнцыі рэгіянальнага культурнага развіцця, выдзяляць, фармуляваць і ацэньваць ключавыя напрамкі і асаблівасці развіцця розных этнакультурных рэгіёнаў;

выдзяляць асноўныя этапы і крыніцы фарміравання культурнай спадчыны Беларусі, комплекс яе характарыстык;

характарызаваць матэрыяльную культуру і мастацтва Беларусі, этапы і заканамернасці іх развіцця, прадстаўляць і характарызаваць нацыянальную своеасаблівасць беларускай культуры і мастацтва ў кантэксце агульнасусветных мастацкіх працэсаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» студэнты павінны *ведаць*:

– сувязь прычын і следства гістарычных падзей і працэсаў тэхнічнага прагрэсу;

– сутнасць як рэвалюцыйнага, так і эвалюцыйнага шляху развіцця тэхнічнага прагрэсу і яго ўплыў на эканоміку Беларусі;

– інфармацыйныя крыніцы ў дадзеным кірунку;

– методыку самастойнай работы з крыніцамі і апрацоўкі інфармацыі;

– методыку выкарыстання набытых ведаў у музейнай працы;

– навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне.

Студэнты павінны *ўмець*:

– вызначаць ролю гісторыі матэрыяльнай культуры Беларусі ў агульным гістарычным працэсе развіцця сусветнай цывілізацыі;

– дакладна аналізаваць гістарычныя падзеі і факты і іх уплыў на тэхнічны прагрэс, параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, адлюстраваныя ў гістарычных крыніцах;

– крытычна аналізаваць крыніцы на розных мовах і аргументаваць уласны пункт гледжання;

– выкарыстоўваць інфармацыйныя крыніцы ў музейнай працы;

– выкарыстоўваць найноўшыя навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне ў фондавай і экспазіцыйнай музейнай рабоце.

Студэнты павінны *валодаць*:

– прафесійнымі навыкамі аналізу і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў у галіне гісторыі матэрыяльнай культуры Беларусі;

– навыкамі стварэння інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме вучэбнай дысцыпліны.

Асноўнымі формамі навучання па вучэбнай дысцыпліне з'яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, у фондах, дзе знаходзяцца археалагічныя і этнаграфічныя калекцыі.

Вучэбная праграма «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена па змесце з вучэбнымі праграмамі вучэбных дысцыплін «Гісторыя Беларусі», «Археалогія», «Этналогія Беларусі», «Этналогія», «Гістарычнае краязнаўства» і інш.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» ўсяго прадугледжана 136 гадзін, з якіх 68 – аўдыторных. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 48 гадзін, семінарскія заняткі – 20 гадзін. Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Форма правядзення прамежкавай атэстацыі – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме гуманітарнай адукацыі як базавай вучэбнай дысцыпліны па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Сувязь вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Прадмет вучэбнай дысцыпліны. Структура вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю. Агляд асноўнай і дадатковай літаратуры па вучэбнай дысцыпліне. Вызначэнне тэрмінаў і паняццяў: культура, цывілізацыя, матэрыяльная культура, духоўная культура.

### Раздзел І. Першабытнае грамадства

### Тэма 1. Станаўленне матэрыяльнай культуры чалавецтва ў перыяд каменнага веку

Станаўленне чалавека. Ад архантропа да неантропа. Развіццё антрапалогіі як навукі. Знаходкі рэштак першабытнага чалавека ў Афрыцы і Азіі. З'яўленне чалавека ў Еўропе. Асноўныя перыяды палеаліту. Палеалітычнае мастацтва.

Змены ў клімаце, узнікненне сучаснага рэльефу Еўропы і Азіі. Рассяленне першабытнага чалавека. Засяленне Амерыкі. Крэмніевыя прылады працы. Мікраліты і макраліты. Пераход да новых формаў палявання. Лук і стрэлы. Першы сухапутны і водны транспарт. З'яўленне свойскай жывёлы. Рыбалоўства і збіральніцтва. Развіццё матрыярхату.

### Тэма 2. Першыя людзі на тэрыторыі Беларусі

Пачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі ў эпоху сярэдняга палеаліту. Тагачасны клімат. Зледзяненні (дняпроўскае, сожскае, валдайскае). Першыя прылады працы.

Верхні палеаліт. Першыя стаянкі. Бердыж (Чачэрскі раён). Юравічы (Калінкавічскі раён). Палеалітычнае мастацтва. Грэнская і свідэрская культуры эпохі фінальнага палеаліту.

Мезаліт. Новыя кліматычныя ўмовы. Мікраліты і макраліты. Стаянкі часоў мезаліту. Свідэрская мезалітычная культура. Сожская, днепра-дзвінская, бутаўская культура. Матрыярхат.

### Тэма 3. Неалітычная рэвалюцыя

Паляўнічыя і рыбаловы. Новыя прылады працы. Першыя манументальныя збудаванні Еўропы. Мегаліты і менгіры. Даместыкацыя, жывёлагадоўля, матычнае земляробства. Ганчарства і ткацтва. Марскі і рачны транспарт.

Шліхтаваныя каменныя прылады працы. Першы гліняны посуд. Асновы земляробства і жывёлагадоўлі. Неалітычныя крамянёвыя шахты. Днепра-данецкая культура. Нарвенская культура. Апрацоўка бурштыну.

Нёманская культура. Скульптурныя выявы. Культура лейкападобных кубкаў. Асноўныя тыпы неалітычнага арнаменту. Віды жытла.

### Тэма 4. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі

Росквіт каменнай індустрыі на тэрыторыі Беларусі. Новыя спосабы апрацоўкі крэменю. Мастацтва эпохі бронзы. Першыя шкляныя пацеркі і бісер. Вырабы з бурштыну. Арнаментыка керамікі і яе асноўныя формы. Апрацоўка бронзы. Сякеры-кельты. Археалагічныя культуры бронзавага веку. Плямёны шнураванай керамікі. З'яўленне старажытных індаеўрапейцаў. Культ камянёў.

### Тэма 5. Матэрыяльная культура плямён жалезнага веку

Умацаванне патрыярхальна-родавага ладу, рост прадукцыйных сіл, развіццё жывёлагадоўлі і земляробства, з'яўленне ўстойлівых этнічных аб'яднанняў. Мілаградская, паморская і зарубінецкая культуры. Днепра-дзвінская культура. Культура штрыхаванай керамікі. Балцкія плямёны, гарадзішча Банцараўшчына. Готы і гепіды на тэрыторыі Беларусі. Вельбарская культура. Палі пахавальных урнаў. Падклёшавыя пахаванні і кенатафы. Печы-домніцы. Першыя славяне ў Беларусі. Пражская культура.

### Тэма 6. Насельніцтва Беларусі ў VI-VIII стст. Помнікі матэрыяльнай культуры

Арэал рассялення балтаў у Еўропе. Заходнія, усходнія і дняпроўскія балты. Асноўныя рысы матэрыяльнай культуры балцкіх плямён. Балцкія гарадзішчы. Усходнелітоўскія курганы і пахавальны абрад. Асноўныя этнічныя прыкметы балтаў (адзенне, абутак, упрыгожванні, кераміка, зброя). Яцвягі ў Беларусі, асноўны арэал рассялення. Каменныя курганы.

Рассяленне славян па Дзясне і Дняпры. Племянныя групы крывічоў і іх асноўная тэрыторыя рассялення. Полацкія крывічы (палачане). Смаленскія крывічы. Пскоўскія крывічы. Этнонім тэрміна «крывічы» і яго паходжанне. Пісьмовыя крыніцы аб крывічах. Культура доўгіх курганоў паўночнай Беларусі. Пскоўскія і смаленскія доўгія курганы. Круглыя курганы X–XI стст. Характэрныя этнічныя прыкметы полацкіх і смаленскіх крывічоў. Скроневыя колцы. Пераход да хрысціянскага пахавальнага абраду. Тры хвалі славянскай каланізацыі. Матэрыяльная культура дрыгавічоў і радзімічаў.

## Раздзел II. Матэрыяльная культура Беларусі IX-XII стст.

### Тэма 7. Усходнеславянскі горад IX-XII стст.

Сістэма ўмацавання славянскіх гарадзішчаў. Пларіроўка гарадоў. Характарыстыка дзядзінца і пасада. Вакольны горад. Капішчы, жыллё і гаспадарчыя будынкі. Курганы і курганныя некропалі. Гарадская і вясковая культура. Уплыў хрысціянства на гарадскую культуру.

### Тэма 8. Манументальнае дойлідства XI-XII стст. Візантыйскі перыяд

Новыя будаўнічыя матэрыялы і канструкцыі. Полацкая Сафія. Архітэктурныя школы XII ст.: Полацкая, Віцебская, Гродзенская. Тураўскі храм. Будаўнічыя арцелі.

### Тэма 9. Апрацоўка металу

Першыя домніцы. Узнікненне кавальства. Апрацоўка каляровых металаў. Ювелірныя майстэрні. Крыж Еўфрасінні Полацкай. Выраб зброі. Зброя блізняга і дальняга бою. Даспехі мясцовых ваяроў.

### Тэма 10. Гарадская матэрыяльная культура

Ганчарства. Пераход ад ляпной да кругавой керамікі. Апрацоўка дрэва. Дзейнасць цесляроў і бондараў. Ткацтва. Ткацкія станкі, вязанне і вышыўка. Апрацоўка косці. Цыркульны арнамент. З'яўленне шашак і шахмат. Шкларобства. Пацеркі і бранзалеты. Гарбарства. Скураны абутак і конскія вырабы. Апрацоўка каменю. Шыферныя праселкі. Гандлёвыя сувязі і імпартныя тавары.

## Раздзел III. Матэрыяльная культура Беларусі XIII – перш. паловы XVI стст.

### Тэма 11. Беларускі горад, мястэчка і вёска

Планіроўка беларускіх гарадоў. Уплыў гатычнага мастацтва на каменную архітэктуру. Вежы-данжоны, замкі-кастэлі, абарончыя храмы. З'яўленне мястэчак. Іх планіроўка і забудова. Змены ў пахавальным абрадзе. З'яўленне на Беларусі яўрэяў і татар. Асаблівасці іх матэрыяльнай культуры. Забудова беларускай вёскі. Жытло сялян і шляхты.

### Тэма 12. Асаблівасці гарадской і вясковай культуры

Ганчарства і кафлярства. З'яўленне цэхаў у гарадах. Росквіт кавальства, гарбарства і кушнерства. Халодная і агнястрэльная зброя. Узнікненне кнігадрукавання і пашырэнне адукацыі сярод насельніцтва.

### Тэма 13. Беларускі касцюм

З'яўленне еўрапейскай моды. Адзенне магнатаў, шляхты, сялян. Жаночае і мужчынскае адзенне. Верхняе адзенне. Паясы, галаўныя ўборы, абутак, прычоскі.

## Раздзел IV. Матэрыяльная культура беларусаў другой паловы XVI-XVIII стст.

### Тэма 14. Забудова беларускіх гарадоў і мястэчак. Вясковая архітэктура

Архітэктура Рэнесансу. Бастыённыя замкі, ратушы і кальвінскія зборы. Новыя будаўнічыя матэрыялы і тэхналогіі. Архітэктура барока і ракако. Тры стадыі барочнай архітэктуры. Віленскае барока. Драўляная сакральная

архітэктура. Асноўныя тыпы жылых і гаспадарчых будынкаў. Садова-паркавая архітэктура.

### Тэма 15. Беларускае кафлярства і шкларобства

Адраджэнне вытворчасці паліванай керамікі на Беларусі. Беларускі фаянс і паўфаянс. Гаршковая, кратавая і каробчатая кафля. Эвалюцыя кафляных печаў. З'яўлянне паліванай і паліхромнай кафлі. Распісная кафля. Адраджэнне беларускага шкларобства ў XVI ст. Буды і гуты. Гутнае шкло. Шкляная мануфактура. Шкляны імпарт.

### Тэма 16. Транспартныя сродкі

Дарогі, каналы і масты. Паштовая сувязь. Гужавы транспарт. Конская вупраж. Корчмы і заездныя двары. Водны транспарт. Торгі, кірмашы, гарадскія рынкі.

### Тэма 17. Культура харчавання беларусаў

Аснова харчовага рацыёну насельніцтва. Прадукты земляробства, гародніны і жывёлагадоўлі. Дадатковыя крыніцы харчовага рацыёну (рыба, мёд, мяса дзічыны, ягады, грыбы). Ежа магнатаў і шляхты. "Заморскія" прыправы. Кухонны і сталовы посуд.

### Тэма 18. Матэрыяльная культура этнічных групаў (яўрэі, татары, стараверы)

Кагалы ў гарадах і мястэчках. Рассяленне яўрэяў па тэрыторыі Беларусі з XVI па XVIII стст. Каменныя і драўляныя сінагогі і малітоўныя дамы. Яўрэйскія могілкі і надмагіллі. Рассяленне татараў XIV – XV стст. на тэрыторыі Заходняй і Цэнтральнай Беларусі. Мячэці і татарскія могілкі (мізары). Алькітабы. З'яўленне ў XVIII ст. рускіх стараабрадаўцаў на тэрыторыі Усходняй Беларусі. Стараабрадніцкія храмы і абразы. Музей стараабрадаўскай культуры ў г. Ветка.

## ВУЧЭБНА-МАТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КРС | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| Уводзіны | 2 | | | |
| **Раздзел I. Першабытнае грамадства** | | | | |
| Тэма 1. Станаўленне матэрыяльнай культуры чалавецтва ў перыяд каменнага веку | 2 | | | |
| Тэма 2. Першыя людзі на тэрыторыі Беларусі | 2 | | | |
| Тэма 3. Неалітычная рэвалюцыя | 2 | 2 | | |
| Тэма 4. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі | 2 | | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| Тэма 5. Матэрыяльная культура плямён жалезнага веку | 2 | | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| Тэма 6. Насельніцтва Беларусі ў VI-VIII стст. Помнікі матэрыяльнай культуры | 2 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| **Раздзел II. Матэрыяльная культура Беларусі IX-XII стст.** | | | | |
| Тэма 7. Усходнеславянскі горад IX-XII стст. | 2 | | | |
| Тэма 8. Манументальнае дойлідства XI-XII стст. Візантыйскі перыяд | 2 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| Тэма 9. Апрацоўка металу | 2 | | | |
| Тэма 10. Гарадская матэрыяльная культура | 2 | 2 | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **Раздзел III. Матэрыяльная культура Беларусі XIII – перш. паловы XVI стст.** | | | | |
| Тэма 11. Беларускі горад, мястэчка і вёска | 2 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| Тэма 12. Асаблівасці гарадской і вясковай культуры | 2 | | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| Тэма 13. Беларускі касцюм | 2 | | | |

| Раздзел IV. Матэрыяльная культура беларусаў другой паловы XVI-XVIII стст. | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тэма 14. Забудова беларускіх гарадоў і мясэчак. Вясковая архітэктура | 2 | 2 | | |
| Тэма 15. Беларускае кафлярства і шкларобства | 2 | | | |
| Тэма 16. Транспартныя сродкі | 2 | | 2 | выбарачнае апытанне |
| Тэма 17. Культура харчавання беларусаў | 2 | 2 | | |
| Тэма 18. Матэрыяльная культура этнічных групаў (яўрэі, татары. стараверы) | 2 | 2 | | |
| Разам | 38 | 16 | 14 | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА


*Асноўная літаратура*

1. Загорульский, Э. М. Археология : учеб. пособие / Э. М. Загорульский. – Минск : БГУ, 2020. – 343 с. – URL: https://e.lanbook.com/book/180443 (дата обращения: 12.02.2026).
2. Калечыц, А. Г. Мезалітычныя помнікі Беларусі / А. Г. Калечыц, А. У. Коласаў. – Мінск : Беларуская навука, 2021. – 368, [1] с. : іл.
3. Нароўская, А. М. Семіётыка традыцыйнага жылля беларусаў : у 2 кн. / А. М. Нароўская ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2022. – Кн. 1. Жыллё як сімвал культуры. – 227 с.

*Дадатковая літаратура*

1. Калечыц, А. Г. Чалавек і асяроддзе: каменны век, Заходняе Палессе : [манаграфія] / А. Г. Калечыц. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – 583, [1] с. : іл., каляр. іл., карты, табл.
2. Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі / А. К. Карабанаў [і інш.]. – 2-е выд., дап. і перапрац. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – 403, [1] с. : каляр. фот.
3. Мальдзіс, А. Як жылі нашы продкі ў XVIII ст.? / А. Мальдзіс. – Мінск : Лімарыус, 2001. – 384 с.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне. Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і вучэбнай дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне экзамена.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўцы да экзамена і інш.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;

– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамена.

## Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання студэнтаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы, у тым ліку і археалагічна-этнаграфічную практыку.